Беларусь.info

№94 7/08/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*

**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Некалькі дзесяткаў чалавек больш двух гадзінаў перакрывалі чыгунку ў Барысаве. Жыхары Барысава перакрылі чыгунку на станцыі. Яны патрабавалі сустрэчы з гарадскімі ўладамі.** Забастоўку на рэйках зладзілі каля 30-ці жыхароў. Прычынай іх пратэсту сталі моцныя залевы. Ад надвор'я пацярпелі каля 50 жылых дамоў і падворкаў. На сустрэчу з гараджанамі прыехалі старшыня Барысаўскага гарвыканкаму і яго намеснік. Чыгунка была перакрытая каля дзвюх з паловай гадзінаў.

**Сёньня ў Берасьці некаторыя ўдзельнікі галадоўкі заяўлялі пра магчымае спыненьне акцыі.** Як паведаміў Віктар Чайкоўскі, узьнікла рэальная небясьпека жыцьцю Любовіч Разановіч. Ужо сем сутак жанчына трывае сухую галадоўку, і сіла пакідае яе. Акцыя пратэсту ў Берасьці пачалася 5 ліпеня. У ёй удзельнічае 15 чалавек. Гэта ўладальнікі маршрутных таксі, іхныя сваякі, кіроўцы й двое прадпрымальнікаў-гандляроў. Удзельнікі акцыі пратэстуюць супраць трактоўкі Ўказу прэзыдэнта №140 ад 22 сакавіка 2004 году аб рэспубліканскім зборы за ўвоз у краіну транспартных сродкаў з камэрцыйнай мэтай.

**Адвакаты асуджаных актывістаў "Партнёрства" падрыхтавалі касацыйныя скаргі.** Аспрэчваць прысуд будуць абаронцы Цімафея Дранчука і Мікалая Астрэйкі. Юрысты кажуць, што суд прыняў празмерна жорсткае рашэнне. Нагадаем, што актывістаў "Партнёрства" асудзілі да розных тэрмінаў зняволення. Мікалай Астрэйка атрымаў два гады зняволення, Цімафей Дранчук — год зняволення ў калоніі агульнага рэжыму.

**Інфармацыя аб прыбытках чыноўнікаў аб'яўлена службовай таямніцай**. Беларускі ўрад сваёй пастановай зацьвердзіў інструкцыю пра парадак захаваньня і праверак дэкляpацый аб прыбытках і маёмасьці дзяржаўных чыноўнікаў. Паводле гэтай інструкцыі інфармацыя аб прыбытках дзяржслужбоўцаў з'яўляецца службовай таямніцай і не падлягае апублікаваньню.

# Факты

**У Лібане застаецца каля паўсотні беларусаў.** Паводле беларускага зьнешнепалітычнага ведамства, з зоны лібана-ізраільскага канфлікту эвакуаваны 442 грамадзяніна Беларусі й некалькі дзясяткаў небеларусаў – перадусім, дзяцей ад зьмешаных шлюбаў. МЗС Беларусі мае зьвесткі яшчэ пра паўсотню этнічных беларусаў, якія адмовіліся пакідаць рэгіён. Адначасова назіраецца тэндэнцыя вяртаньня зь Ізраілю некаторых былых грамадзян Беларусі, якія ў розныя часы зьехалі ў гэтую краіну.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org